# [У ходзе пасяджэння калегіі Мінсувязі разгледжаны пытанні развіцця галіновай і рэгіянальнай інфарматызацыі](https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/29-08-2019-5183)

29 жніўня 2019 г. у Міністэрстве сувязі і інфарматызацыі адбылося пасяджэнне калегіі, прысвечанае пытанням развіцця галіновай і рэгіянальнай інфарматызацыі.

Удзел у пасяджэнні ўзялі члены калегіі Мінсувязі, прадстаўнікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, абласных выканаўчых камітэтаў і Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, адказныя за развіццё інфарматызацыі.

У ходзе праведзенага пасяджэння абмеркаваны пытанні ўзаемадзеяння Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Міністэрства сувязі і інфарматызацыі па пытаннях цыфравізацыі галін.

Генеральным дырэктарам АІПІ НАН Беларусі А.В.Тузікавым ў выступе прапанаваны асноўныя напрамкі навукова-метадычнага забеспячэння лічбавай трансфармацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Намеснікам генеральнага дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце АІПІ НАН Беларусі С.В.Круглікавым прадстаўлены практычныя прыклады цыфравізацыі галін на падставе рашэнняў, выкананых інстытутам і якія паспяхова эксплуатуюцца ў розных сферах дзейнасці.

Намеснік Міністра сувязі і інфарматызацыі А.Н.Рабава інфармавала аб ходзе выканання мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы развіцця лічбавай эканомікі і інфармацыйнага грамадства на 2016 - 2020 гады, напрамках павышэння эфектыўнасці іх рэалізацыі шляхам удасканалення заканадаўства ў сферы інфарматызацыі, а таксама прадставіла асноўныя падыходы да фарміравання дзяржаўнай праграмы інфарматызацыі на 2021 - 2025 гады.

У працэсе праведзенага абмену думкамі і абмеркавання пазначаных пытанняў удзельнікі пасяджэння ў цэлым падтрымалі прапанаваныя Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі і АІПІ НАН Беларусі напрамкі далейшай працы ў сферы інфарматызацыі як у кароткатэрміновай, так і ў доўгатэрміновай перспектыве.

---

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/29-08-2019-5183*